ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 1 (835) ● Чацвер, 13 студзеня 1972 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXV

50-годдзю УТВАРЭННЯ СССР— ДАСТОЙНУЮ СУСТРЭЧУ!

Зварот да ўсіх прафесараў, дацэнтаў, выкладчыкаў, навуковых работнікаў. аспірантаў, студэнтаў, супрацоўнікаў універсітэта.

У гонар 50-годдзя утварэння СССР па усёй краіне разгарнулася сацыялістычнае спаборніцтва па дастойнай сустрэчы гэтай знамянальнай даты.

Лепшым укладам нашага універсітэта у развіццё матэрыяльна-тэхнічнай базы камунізму з'явіцца добрая пастаноука вучэбна-выхаваучай і навукова-даследчай работы на факультэтах, кафедрах, у лабараторыях, аддзелах і у вучэбных групах.

Рэктарат, партком і мясцком, камітэт камсамола, прафком універсітэта звяртаюцца з заклікам да усіх прафесараў, дацэнтаў, выкладчыкаў, навуковых работнікаў, аспірантаў, студэнтаў, супрацоўнікаў універсітэта актыуна уключыцца у сацыялістычнае спаборніцтва па дастойнай сустрэчы 50-годдзя утварэння СССР.

РЭКТАРАТ
ПАРТКОМ
МЯСЦКОМ
КАМІТЭТ КАМСАМОЛА
ПРАФКОМ.

СЕСІЯ



НІ ПУХУ, НІ ПЕР'Я!

У першы раз усё нязведана, цьмяна... І калі за дзвярыма рашаецца праблема «Быць ці не быць», то тут, у калідоры, на тварах першакурснікаў журфака толькі адно нямое пытанне: «Што гэта будзе?» Прауда, «старыя» шчодра дзяліліся сваім вопытам. Праходзячы міма, хто-небудзь з іх абавязкова скажа:

— Што вашы экзамены? Лягчэй лёгкага... Мы іх у свой час, як арзшкі лускалі...

— Бачыш, якая памяць кароткая,— з'едліва нехта адказвау.

Але зараз жа усе зноу паглыбляюцца у падручнікі. Бо сёння першакурснікі пераадольваюць першую вышыню—здаюць гісторыю КПСС. Залік прымае прафесар А. Я. Журау.

— Добра, далей, калі ласка.

Слава Харытонаў расказвае аб пастаноуцы нацыянальнага пытання у дарэвалюцыйнай Расіі, аб работах У. І. Леніна, і толькі у голасе адчуваецца хваляванне.

Мяняюцца перад сталом экзаменатара рабяты, і на твары у Анатоля Яфімавіча, нібы у люстры, адбіваецца адказ кожнага з іх. У гэты ж час выкладчык вывучае кожнага са студэнтау. Вось замінка у адказе Алёшы Толсціка, і зараз жа пытанні: «А як? Калі?..» Задаюцца яны спакойна, амаль дабрадушна. Упэунена гучыць адказ. І, здавалася б, усё добра, ды не зусім... Яшчэ пытанне, яшчэ... Адчуваецца, што Анатоль Яфімавіч не зусім задаволены адказам. Вось і даводзіцца Алёшы «пацець» над дадатковымі пытаннямі. У гэты час засяроджана рыхтуюцца Аркадзь Шульмэн, Міша Шамкоу, Таня Сідарава. Адзін за другім пройдуць яны перад строгім і добрым поглядам экзаменатара.

...За дзвярыма — праз даужэнне экзамена, бо тут чакаюць і хвалююцца за сяброу аднакурснікі. Як толькі закрыліся дзверы за Аляксеем Толсцікам — ён трапіў пад абстрэл пытанняу: «Што? Як?»

— Усё нармальна, рабяты, нармальна.

Дарагія першакурснікі, у вас наперадзе яшчэ многа сесій. Дык выцягвайце заусёды самыя шчаслівыя білеты, атрымлівайце выдатныя адзнакі. Ні пуху вам, ні пер'я!

Т. ТАРЛЕЦКАЯ.

ПЕРШЫ ЭКЗАМЕН

ПРАНІЦАЙ усе на месцы, каля аудыторыі. Нязвыклая для вуха цішыня, не чутна вясёлых галасоу, Сур'ёзныя твары у хлопцаў і дзяучат. Некалькі ціхіх пытанняу, і зноу галовы нізка апускаюцца над падручнікам. Уся ўвага студэнтау зараз скацэнтравана на тым, каб паспець праглядзець усё, яшчэ раз паутарыць знаёмае, распытаць пра незразумелае.

Роуна у 9 гадзін экзамен пачауся. На калідоры, на падаконніках застаюцца разгорнутыя падручнікі па гісторыі КПСС, а іх «гаспадары» зараз выкладваюць свае веды. Усе чакаюць, хто першы выйдзе. На парозе Слава Ракіцкі з пачырванелым тварам. Яго акружаюць, нехта заглядвае у залікоуку, а нехта, яшчэ не пачуушы адзнаку, цісне руку, віншуе.

— Што? Як?

— Пяць!

— Малайчына!

Пытанні сыплюцца адно за адным: пра што пытаюць? Як адказваюць?

Праходзіць некалькі хвілін, і ужо высоквае з прадасным тварам і ззяючымі вачыма Аня Лабашэвіч, пасля — Надзя Жугіна, Тамара Лукашэвіч...

На калідоры смех, гоман, а тут, у аудыторыі—маукліва-напружаныя абставіны. Пяць чалавек схілілся над сваімі экзаменацыйнымі білетамі. Адзін падымае галаву, нешта успамінае, затым імгненна рука перакрэслівае напісанае, і новыя думкі, словы кладуцца на паперу.

— Добра, хопіць. Калі ў асноўным была пабудавана эканамічная база сацыялізму? — вочы экзаменатара, доктара гістарычных навук, прафесара Мяфодзія Іларыёнавіча Ігнаценкі строга пазіраюць на студэнтку. Як і заусёды, ён патрабуе кароткі, канкрэтны адказ.

— Празільна, калі ласка, другое пытанне.

Ларыса Кузьміна гаворыць упэунена, змястоуны адказ яе сумнення не пакідае: ведае.

— Хопіць, — Мяфодзій Іларыёнавіч цвёрда ставіць «Добра».

Наступны студэнт расказвае пра пабудову сацыялізму у СССР, пра барацьбу супраць буржуазнай ідэалогіі.

Экзамен ідзе хутка і цікава. Гэта ужо заканамерна, што калі студэнт сістэматычна рыхтавауся на працягу года, добра наведваў лекцыі, уважліва слухаў іх, то веды у яго трывалыя.

...Некалькі хвілін — і на першае пытанне дадзен поўны адказ. Тэрэза Падгайная расказвае пра работу Камуністычнай партыі у цяжкі перыяд Вялікай Айчыннай вайны. Крыніцы для выдатнага адказу у яе вялікія: прачытана шмат літаратуры, грунтоуная падрыхтоука да практычных заняткаў.

Дзяучына з задаволенай усмешкай бярэ заліковую кніжку. А сяороукі ужо ведаюць: адказаць ніжэй выдатна яна не можа.

...Перад экзаменатарам юнак. Ён доуга робіць вывад са сказанага, часта памыляецца. Экзаменатар уважліва слухае, дае дадатковае пытанне.

Студэнт некалькі хвілін маўчыць, пасля няупэунена пачынае гаварыць. Яшчэ некалькі пытанняу, і аб'ектыуная тройка з'яуляецца у залікоуцы.

Адны выходзяць з аудыторыі вясёлыя, другія расчараваныя, незадаволеныя. Большасць другакурснікаў журфака добра ведала матэрыял па гісторыі КПСС і атрымала выдатныя і добрыя адзнакі, і толькі некалькі чалавек паказалі здавальняючыя веды.

В. ЛАПЦІК,
студэнт.

Ідзе экзамен па фізічнай геаграфіі зарубежных краін у студэнтау III курса геаграфічнага факультэта. Прымае яго доктар геаграфічных навук, прафесар **В. Р. Заурыеў.** Ля карты—Дзіна **Зубар.**

Фота **Д. Чаховіча.**

Студэнткі V курса біяфака І. МАСЛАВА і кіраунік яе дыпломнай работы кандыдат біялагічных навук І. І. ДАЎГАЛЕВІЧ абмяркоуваюць вынікі чарговых доследау.

Фота **Д. Чаховіча.**

ПАЛАЖЭННЕ

АБ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫМ СПАБОРНІЦТВЕ У БДУ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА ЗА ПАСПЯХОВАЕ АЖЫЦЦЯЎЛЕННЕ РАШЭННЯЎ XXIV З'ЕЗДА КПСС І ПА ДАСТОЙНАЙ СУСТРЭЧЫ 50-ГОДДЗЯ ЎТВАРЭННЯ СССР.

У сацыялістычнае спаборніцтва ўключаецца увесь калектыў універсітэта.

Сацыялістычнае спаборніцтва праводзіцца паміж студэнтамі, супрацоўнікамі, студэнцкімі вучэбнымі групамі, калектывамі кафедр, лабараторый, факультэтаў, падраздзяленняў універсітэта.

Сацыялістычнае спаборніцтва арганізуецца і праводзіцца адміністрацыяй сумесна з прафсаюзнай і камсамольскай арганізацыямі пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі.

Індывідуальныя і калектыўныя абавязацельствы прымаюцца студэнтамі і супрацоўнікамі універсітэта на вучэбны год. Абавязацельствы павінны быць накіраваны на паляпшэнне ідэйна-палітычнага выхавання, павышэнне працоўнай дысцыпліны, паляпшэнне вучэбнай, метадычнай і навукова-даследчай работы ва універсітэце, на далейшае умацаванне творчай садружнасці універсітэта з вытворчасцю.

Пры разгортванні сацыялістычнага спаборніцтва трэба няспынна здзяйсняць ленінскія прынцыпы яго арганізацыі: галоснасць, параўнальнасць вынікаў, магчымасць паўтарэння вопыту, таварыская узаемадапамога.

Сацыялістычныя абавязацельствы калектыву (кафедр, вучэбных груп, лабараторый, аддзелаў і г. д.) састаўляюцца на аснове індывідуальных абавязацельстваў іх членаў і адлюстроўваюць іх ініцыятыву і вопыт.

Умовы калектыўных сацыялістычных абавязацельстваў абмяркоўваюцца і зацвярджаюцца на агульных сходах калектываў вучэбных груп, кафедр, факультэтаў, лабараторый, аддзелаў.

(Заканчэнне на 2-й стар.).

СЕСІЯ

Старшы выкладчык Н. Ц. ПРЫМАЧУК праводзіць кансультацыю па вышэйшай матэматыцы ў студэнтаў I курса хімфака

ШТО Ў ЦЯБЕ Ў ЗАЛІКОЎЦЫ?

Ідзе сесія. У доугіх калідорах усіх карпусоу каля многіх аудыторый групы студэнтау. На дзвярах надпіс: «Цішэй! Ідзе экзамен». Адны з такіх дзвярэй мы і адчынілі. Тут трэцяя група III курса факультэта агульнай матэматыкі здае экзамен па тэарэтычнай механіцы. Выкладчык Валерый Аляксеевіч Савенкау ціха гутарыць з дзяучынай. Здалося, што зусім не на экзамен мы прыйшлі, а на звычайныя практычныя заняткі: сядзяць студэнт і выкладчык побач і разбіраюць нейкае складанае пытанне.

Чарнявая дзяучына, што адказвае зараз, — Таня Каваль. Блытаецца у пытаннях. А вось і зусім маучыць. Валерый Аляксеевіч спакойна і тактоуна растлумачвае, дапамагае знайсці знікаючую нітачку адказу. Гэта псіхалагічныя моманты экзамена. Тут усё, як бачым, добра.

А як жа адзнакі? Таня Каваль атрымала здавальняюча. Дзяучына, што адказвала за ёй,— таксама.

— Мацнейшыя студэнты здаюць, як правіла, з раніцы. Гэта ужо няпісаны закон, — гаворыць Валерый Аляксеевіч. — Так што выдатных адзнак больш, мабыць, не будзе. Сапрауды, у экзаменацыйнай зецамасці ёсць добрыя адзнакі, а студэнты Н. Нікіфэрава, Нгуен Ва Суан і До Суан Тхо атрымалі выдатна.

Толькі троікі усё ж пераважаюць. У чым справа? Ці не гавораць здавальняючыя адзнакі большасці аб нізкім узроуні ведау у студэнтау?

— Бадай што не. Справа у тым, што курс тэарэтычнай механікі вельмі складаны — чытаецца 100 гадзін. А расклад экзаменау не зусім удалы. У параунанні з іншымі групамі часу на падрыхтоуку вельмі мала.

З Валерыем Аляксеевічам цяжка не згадзіцца. Вядома, вучыць трэба на працягу семестра. Толькі многае, пройдзенае на практычных, забываецца, а каб добра усё успомніць, прывесці веды ў сістэму, патрэбен дастатковы час перад экзаменам.

Сесія у разгары. Для адных яна першая, для другіх — апошняя. Але усе хвалююцца аднолькава. Гэта ужо «прафесійнае». Як заусёды, ідзе вайна са шпаргалкамі, перад дзвярыма пераліствающа ліхаманкава канспекты і падручнікі, і традыцыйнае пытанне «Ну, што?» гучыць сто, тысячу разоу.

Поспехау вам, сябры, і прыгожых пяцёрак і чацвёрак у залікоуках!

Л. ДРУЗЕВА.

Які узяць білет? Пакуль можна выбіраць, дзяўчына не спяшаецца. Пашанцуе ці не? Праз хвіліну яна ужо будзе ведаць аб гэтым.

Фота **Д. Чаховіча.**

СЕСІЯ

ДОБРЫЯ ПАМОЧНІКІ

Работнікі аддзела абслугоування універсітэцкай бібліятэкі імкнуцца у сваей паусядзённай працы не толькі забяспечыць студэнта літаратурай, але і прапагандуюць веды, вучаць разумець кнігу.

Вядома, для гэтага існуе шэраг шляхоу. Важнейшыя з іх — арганізацыя кніжных тэматычных выставак, канферэнцый чытачоу, дыспутау па той ці іншай кнізе, сустрэчы з пісьменнікамі і паэтамі, выстаукі новых кніг.

У апошні час, каб лепш пазнаёміць студэнтау з літаратурай, праводзяцца тэматычныя агляды-выстаукі. Толькі за мінулы год работнікі аддзела арганізавалі больш чым пяцьдзесят такіх агляду, а таксама тэматычных выставак, прысвечаных знамянальным датам, такіх, як «У. І. Ленін аб камуністычнай працы», «Камсамол Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны», «Творы Леніна на замежных мовах» і іншыя.

Добрай традыцыяй стала і правядзенне сустрэч чытачоу бібліятэкі з пісьменнікамі, вучонымі, ветэранамі вайны і працы.

Работнікі аддзела Л. К. Пяскоуская, Л. П. Міцкевіч гавораць: «Нашымі добрымі памочнікамі з'яуляюцца многія студэнты, такія, як М. Пауловіч (гістфак), В. Карповіч (геафак), С. Шандора (фізфак). Яны самі па-сапраўднаму любяць кнігу і з'яуляюцца умелымі прапагандыстамі на сваіх факультэтах і курсах».

1971 год быу багаты на юбілеі вядомых рускіх і савецкіх майстроу літаратуры. Работнікі бібліятэкі сумесна з кафедрамі філфака загадзя рыхтавалися да іх. Было вырашана кожную знамянальную дату ператварыць у свята для чытачоу, на якім бы не толькі была аддадзена павага таленту пісьменніка, паэта, а прысутныя змаглі б бліжэй пазнаёміцца з творчасцю мастака, адкрыць нешта велічнае і новае для сябе.

Так, на філалагічным факультэце пры актыуным удзеле работнікау аддзела былі праведзены літаратурныя вечары, прысвечаныя творчасці М. Багдановіча, С. Ясеніна. Кніжныя выстаукі шырока прадстаулялі творы пісьменнікау. Выступалі не толькі студэнты, а і дацэнт С. А. Лысенка, прафесар Д. І. Фіглоуская, доктар філалагічных навук А. А. Лойка, паэт Н. С. Гілевіч. Вялікую цікавасць выклікау літаратурны вечар, прысвечаны 100-годдзю з дня нараджэння класіка украінскай літаратуры Лесі Украінкі. На яго быу запрошан беларускі паэт Мікола Аурамчык. Ён расказаў аб жыццёвым і творчым шляху Лесі Украінкі і прачытау свае пераклады яе вершаў на беларускую мову.

Многа увагі работнікі аддзела абслугоування удзяляюць ваенна-патрыятычнаму выхаванню студэнтау. На геафаку, напрыклад, з вялікім поспехам прайшлі канферэнцыі па кнізе былога сакратара Палескага абкома партыі І. Д. Вятрова «Браты па зброі». Перад прысутнымі выступілі аутар І. Д. Вятроў, Герой Савецкага Саюза Г. А. Такуеў. У арганізацыі вечара на геаграфічным факультэце прыняла актыуны удзел кандыдат эканамічных навук Л. А. Пауловіч.

Работнікі аддзела імкнуцца прыцягваць да грамадскай работы як мага больш людзей. Пры бібліятэцы створан савет студэнтау, які аказ... вялікую дапамогу супрацоунікам у арганізацыі масавых мерапрыемстваў. Асабліва хочацца адзначыць такіх студэнтау, як В. Феранц, В. Фясько, М. Тарасік і іншыя.

Р. АЛЯКСАНДРАУ.

ПАЛАЖЭННЕ

АБ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫМ СПАБОРНІЦТВЕ Ў БДУ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА ЗА ПАСПЯХОВАЕ АЖЫЦЦЯЎЛЕННЕ РАШЭННЯЎ XXIV З'ЕЗДА КПСС І ПА ДАСТОЙНАЙ СУСТРЭЧЫ 50-ГОДДЗЯ ЎТВАРЭННЯ СССР.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

Ход выканання абавязацельстваў разглядаецца на пасяджэннях вучоных саветаў факультэтаў, вучонага савета ўніверсітэта, на прафсаюзных і камсамольскіх сходах і вытворчых нарадах, асвятляецца ў газеце «Беларускі універсітэт», насценных газетах.

Вынікі сацыялістычнага спаборніцтва падводзяцца напярэдадні 50-годдзя утварэння СССР.

Вынікі выканання сацыялістычных абавязацельстваў падводзяцца з улікам наступных паказчыкаў:

І. Павышэнне ідэйна-тэарэтычнага ўзроўню і кваліфікацыі выкладчыцкага і вучэбна-дапаможнага саставу, інжынерна-тэхнічных работнікаў, рабочых і служачых.

2. Дакладная арганізацыя вучэбнага працэсу і пастаяннае ўдасканаленне методыкі навучання, забеспячэнне высокага ўзроўню правядзення лабараторных работ, выканання курсавога і дыпломнага праектавання, правядзення вытворчай практыкі студэнтаў.

3. Стан вучэбнай і працоўнай дысцыпліны, падтрыманне маральных прынцыпаў будаўніка камунізму.

4. Выкананне навукова-даследчых работ (дзяржбюджэтная тэматыка, студэнцкія работы), правядзенне навукова-метадычных і навукова-тэхнічных канферэнцый.

5. Сувязь з вытворчасцю (работы па супрацоўніцтве, навуковае кіраўніцтва, кансультацыі, лекцыі, гаспадарча-дагаворныя работы і г. д.).

6. Стан палітыка-выхаваўчай работы і бытавыя ўмовы у інтэрнатах.

7. Удзел студэнтаў і супрацоўнікаў у грамадскім жыцці ўніверсітэта (спартыўна-масавыя мерапрыемствы, мастацкая самадзейнасць, гутаркі, лекцыі у студэнцкіх групах і г. д.).

8. Стан аховы працы.

9. Утрыманне тэхнікі, абсталявання, памяшканняў і тэрыторыі ўніверсітэта ва ўзорным парадку.

10. Максімальнае выкарыстанне абсталявання, эканомія сыравіны, матэрыялаў і электраэнергіі.

11. Выкананне норм выпрацоўкі пры высокай якасці работ.

Па выніках сацыялістычнага спаборніцтва вызначаецца:

— лепшая вучэбная група на факультэце, ва універсітэце;

— лепшая кафедра на факультэце;

— лепшая агульнаўніверсітэцкая кафедра;

— лепшая праблемная (навукова-даследчая) лабараторыя ва ўніверсітэце;

— лепшы аддзел або іншае падраздзяленне ўніверсітэта;

— лепшы факультэт.

Вынікі выканання сацыялістычных абавязацельстваў падводзяць камісіі, створаныя на агульнаўніверсітэцкіх кафедрах, у праблемных і навукова-даследчых лабараторыях, у аддзелах і падраздзяленнях, на факультэтах з прадстаўнікоў адміністрацыі, партыйных, камсамольскіх, прафсаюзных арганізацый.

Вынікі выканання сацыялістычных абавязацельстваў у цэлым па універсітэту падводзяцца камісіяй, створанай з прадстаўнікоў рэктарата, парткома, камітэта ЛКСМБ, мясцкома і прафкома ў саставе:

1. **А. Н. СЕЎЧАНКА**, рэктар ўніверсітэта—старшыня камісіі.

2. **А. Я. МАЛЫШАЎ**, прарэктар па вучэбнай рабоце —намеснік старшыні.

3. **В. Ф. ЧЫГІР**, старшыня МК—намеснік старшыні.

4. **М. Д. ЦІВА**, намеснік сакратара парткома—член камісіі.

5. **В. С. ДАЛГАРУКАЎ**, начальнік вучэбнага аддзела—член камісіі.

6. **А. Г. СЛУКА**, сакратар камітэта камсамола—член камісіі.

7. **М. М. ДРОЗД**, старшыня прафкома—член камісіі.

8. **М. Я. ЛЯПІЛА**, намеснік старшыні МК—член камісіі.

Пераможцы сацыялістычнага спаборніцтва ўзнагароджваюцца:

— факультэт, які заняў першае месца,— пераходным Чырвоным сцягам і Ганаровай граматай універсітэта, факультэты, заняўшыя другое і трэцяе месцы,—вымпеламі «Пераможцу сацыялістычнага спаборніцтва» і Ганаровай граматай універсітэта;

— факультэцкія кафедры, вучэбныя групы факультэтаў, агульнаўніверсітэцкая кафедра, праблемная або навукова-даследчая лабараторыя, калектыў аддзела або падраздзялення ўніверсітэта, заняўшыя першыя месцы, узнагароджваюцца вымпеламі «Пераможцу сацыялістычнага спаборніцтва» і Ганаровымі граматамі універсітэта;

— вучэбныя групы, заняўшыя першае, другое і трэцяе месцы сярод усіх вучэбных груп універсітэта, —вымпеламі «Пераможцу сацыялістычнага спаборніцтва» і Ганаровымі граматамі універсітэта, а таксама турысцкімі паездкамі па месцах, звязаных з жыццём і дзейнасцю У. І. Леніна і ў Белавежскую пушчу.

БРАТНІМ СУВЯЗЯМ МАЦНЕЦЬ!

Пярэдадзень новага года азнаменаваўся важнай падзеяй у жыцці нашага калектыву — падпісаннем дагавору аб дружбе і супрацоўніцтве з Сафійскім універсітэтам імя К. Ахрыдскага. Для падпісання дагавору у Мінск прыбыла дэлегацыя у саставе прарэктара Сафійскага універсітэта, прафесара Емiла Георгіева, члена - карэспандэнта Балгарскай акадэміі навук, і сакратара парткома дацэнта Васіліны Брэскоускай.

Госці пазнаёміліся з нашым універсітэтам, пабывалі на фізічным факультэце. Прафесар Е. Георгіеу сустрэўся з выкладчыкамі філалагічнага факультэта БДУ. Дацэнт геаграфічнага факультэта Сафійскага універсітэта В. Брэскоуска была госцем калектыву геаграфічнага факультэта універсітэта.

Дэлегацыя з Сафіі была прынята рэктарам БДУ Героем Сацыялістычнай Працы акадэмікам АН БССР А. Н. Сеучанкам. Ён расказаў аб развіцці навукі у нашым універсітэце, аб вялікай ролі навуковага супрацоўніцтва універсітэтаў сацыялістычных краін, спыніўся на перспектывах супрацоўніцтва Беларускага і Сафійскага універсітэтаў.

Прафесар Е. Георгіеу пазнаёміў беларускіх калег з навуковай дзейнасцю балгарскіх вучоных, падкрэсліў неабходнасць далейшага пашырэння сяброўскіх сувязей братніх універсітэтаў.

Сакратар парткома В. Брэскоуска гаварыла аб важнасці кантактаў па лініі навуковай і вучэбнай работы, аб вялікай ролі грамадскіх арганізацый ва умацаванні дружбы нашых універсітэтаў. З вялікім інтарэсам сустрэлі прысутныя паведамленне В. Брэскоускай аб тым, якое ўражанне выклікала выступленне народнага ансамбля танца «Крыжачок» у сталіцы Балгарыі.

Былі выказаны пажаданні, каб сяброўскія кантакты пашыраліся і мацнелі. Глеба для іх самая спрыяльная. У Сафійскім універсітэце цяпер вядзецца вялікая работа па падрыхтоўцы будаўнічага атрада, які будзе працаваць у Беларусі.

Прарэктар БДУ, член-карэспандэнт АПН СССР прафесар С. А. Умрэйка выказаў упэўненасць, што супрацоўніцтва паміж двума універсітэтамі будзе плённым і з'явіцца пэўным укладам ва умацаванне савецка-балгарскай дружбы.

Падпісаны дагавор аб супрацоўніцтве на 1972—1973 гады уключае рад артыкулаў, якія прадугледжваюць калектыўныя работы па актуальных праблемах навукі, камандзіраванне вучоных для чытання курсаў лекцый, абмен студэнцкімі групамі з мэтай праходжання практыкі, пашырэнне супрацоўніцтва паміж грамадскімі арганізацыямі і г. д.

Развітваючыся з нашым універсітэтам, прафесар Е. Георгіеу зрабіў заяву, у якой, у прыватнасці, гаворыцца: «...Сафійскі універсітэт імя Клімента Ахрыдскага павінен стаяць побач з Мінскім універсітэтам імя У. І. Леніна і аб'яднаць свае намаганні у развіцці навукі і падрыхтоўцы назуковых кадраў, быць яго самым блізкім сябрам і братам, — такія думкі натхнілі узнікненне і падпісанне дагавору паміж двума універсітэтамі. Падпісаны дагавор з'яўляецца важным фактарам як для развіцця навукі у Балгарыі і Беларусі, так і для умацавання дружбы двух народаў — балгарскага і беларускага».

М. БАРЫСАЎ.

НА ЗДЫМКУ: балгарскія госці у аудыторыі савецка - балгарскай дружбы на гістарычным факультэце БДУ.

Фота Д. ПРЭСА.



З ВІЗІТАМ ДРУЖБЫ

З 8 па 14 снежня 1971 года у Сафійскім універсітэце імя Клімента Ахрыдскага праходзіў міжнародны студэнцкі сімпозіум «Роля і значэнне прыватных і грамадскіх навук у працэсе фарміравання марксісцка-ленінскага светапогляду у студэнтаў». Па запрашэнню камітэта Дзімітраўскага саюза моладзі у Сафійскі універсітэт выехала дэлегацыя камітэта камсамола БДУ імя У. І. Леніна у саставе: кіраўнік — член парткома універсітэта, дацэнт В. І. Пракошын, член камітэта камсамола універсітэта А. Мельнікаў і я. Сімпозіум быў прыурочан да штогадовага свята балгарскіх студэнтаў. Для удзелу ва урачыстасцях быў запрошан і народны ансамбль танца БДУ «Крыжачок».

Наша дэлегацыя была ўпаўнаважана прыняць удзел у рабоце сімпозіума, правесці перагаворы з камітэтам Дзімітраўскага саюза моладзі СУ аб далейшым пашырэнні супрацоўніцтва паміж універсітэцкімі камсамольскімі арганізацыямі, заключыць дагавор аб дружбе і супрацоўніцтве на 1972 год і устанавіць папярэднюю дагаворанасць аб абмене студэнцкімі будаўнічымі атрадамі летам гэтага года. З усімі гэтымі задачамі дэлегацыя справілася паспяхова.

На сімпозіуме прысутнічалі дэлегацыі універсітэтаў трох гарадоў Савецкага Саюза: Масквы, Мінска і Тарту, а таксама дэлегацыі універсітэтаў Берліна, Кракава, Будапешта, дэлегацыі вну Сафіі, Плоўдзіва, Варны. На шасці пасяджэннях сімпозіума яго ўдзельнікамі было прачытана больш 30 дакладаў па пытаннях выхавання марксісцка-ленінскага светапогляду у студэнтаў. Пасля кожнага пасяджэння праходзіла ажыўленая дыскусія, на якой дэлегацыі абменьваліся вопытам практычнай работы у маладзёжных арганізацыях.

Нельга не адзначыць вялікую работу арганізацыйнага камітэта сімпозіума на чале з намеснікам сакратара камітэта камсамола Сафійскага універсітэта Стаянам Бараковым. Дакладнае выкананне праграмы знаходжання дэлегацыі у многім садзейнічала пасляховаму правядзенню сімпозіума, які выклікаў вялікую зацікаўленасць у балгарскіх студэнтаў.

На ўрачыстым адкрыцці прысутнічалі прарэктар універсітэта І. Тасеу, сакратары партыйнай і камсамольскай арганізацый.

Перад удзельнікамі сімпозіума выступілі намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта па навуцы, тэхнічнаму прагрэсу і вышэйшай адукацыі Румен Папоў, які расказаў аб рэформе вышэйшай адукацыі у Балгарыі, і першы сакратар студэнцкага РК камсамола імя Боцева М. Чабанаў.

Удзельнічалі мы і у святочных урачыстасцях, прысвечаных Дню балгарскіх студэнтаў: на урачыстым пасяджэнні Сафійскага універсітэта у Народнай оперы, дзе рэктар акадэмік Панцялей Зарау выступіў з традыцыйнай акадэмічнай прамовай, ускладанні вянкоў да маузалея Г. Дзімітрава і у святочным шэсці па вуліцах Сафіі.

І, вядома, вельмі цікавай насычанай была культурная праграма.

І. РАБЧЫНСКАЯ,
сакратар камітэта
камсамола філфака.

РАСКАЗВАЕМ АБ ВУЧЭБНЫХ КАБІНЕТАХ

НА ЎЗРОВЕНЬ СУЧАСНАСЦІ

Важная роля ў павышэнні эфектыўнасці навуковай, вучэбнай, метадычнай і выхаваўчай работы кафедр грамадскіх навук належыць іх кабінетам. Практыка паказвае, што сродкі, якімі распараджаецца кабінет, дазваляюць значна павысіць ідэйна-тэарэтычны ўзровень навучання студэнтаў, дабіцца цеснай сувязі навучальнага працэсу з праблемамі грамадскага развіцця, з навейшымі дасягненнямі навукі і тэхнікі.

У нашым універсітэце ўдзяляецца сур'ёзная ўвага павышэнню ролі кабінетаў грамадскіх навук у навучальным працэсе. Прыкладам можа служыць кабінет гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў. Рэктарат, кафедра надавалі вялікае значэнне ўмацаванню яго матэрыяльнай базы. У мінулым годзе зроблен рамонт у кабінеце і ў яго дапаможных памяшканнях, бібліятэка абсталявана стэлажамі, пакой для заняткаў прыстасаван для праслухоўвання гуказапісаў і прагляду дыяфільмаў з павялічаным кадрам, набыты для вучэбных мэт тэлевізар і радыёпрыёмнік.

Сіламі супрацоўнікаў кабінета зроблены стэнд з матэрыяламі XXIV з'езда КПСС, насценныя кніжныя вітрыны, якія дазваляюць чытачам самастойна выбраць патрэбную метадычную распрацоўку, новую кнігу, даследаванні членаў кафедры. Электрыфікаваная карта «Мая рэспубліка» знаёміць студэнтаў з гісторыяй Беларусі, яе прыроднымі рэсурсамі, прамысловасцю, перспектывамі развіцця эканомікі ў дзевятай пяцігодцы.

Вялікая ўвага ўдзелена камплектаванню кабінета літаратурай, наглядным дапаможнікамі і тэхнічнымі сродкамі, абнаўленню, рамонту абсталявання.

У цяперашні час у кабінеце ёсць у дастатковай колькасці творы класікаў марксізму-ленінізму, матэрыялы з'ездаў, канферэнцый, Пленумаў ЦК КПСС, ЦК КПБ і ЦК ВЛКСМ, метадычныя распрацоўкі вузлавых праблем і падручнікі, даведніцкая, мастацкая літаратура і г. д. Кніжны фонд непарыўна абнаўляецца. Ён налічвае больш трох тысяч экземпляраў і ў асноўным задавальняе запатрабаванні студэнтаў, аспірантаў, выкладчыкаў на абавязковую і дадатковую літаратуру.

Сярод наглядных дапаможнікаў ёсць дыяграмы, плакаты, альбомы, карты, літакопіі ленінскіх дакументаў, ілюстрацыі, творы выяўленчага мастацтва.

У дапамогу чытачам створан тэматычны каталог і завяршаецца састаўленне алфавітнага. Своечасова наведвальнікі інфармуюцца аб паступіўшых у продаж новых кнігах па гісторыі КПСС, штомесячна вывешваецца бюлетэнь новых паступленняў у бібліятэку універсітэта. Лабаранты сістэматычна аказваюць дапамогу студэнтам, аспірантам, выкладчыкам у падборы літаратуры. У іх можна атрымаць бібліяграфічныя даведкі. У кабінеце арганізавана дзяжурства выкладчыкаў, якія дапамагаюць студэнтам рыхтавацца да лекцый і семінараў, растлумачваюць складаныя і незразумелыя пытанні.

Работа кабінета здзяйсняецца па зацверджанаму кафедрай плану, у якім першаступенная ўвага звернута на удасканаленне метадычнай работы, павышэнне яго ролі у вучэбным працэсе. Кафедра перыядычна заслухоўвае справаздачы аб выкананні гэтых планаў і намячае меры па ліквідаванню недахопаў.

Цесны кантакт лабарантаў і выкладчынаў дазваляе паусядзённа удасканальваць формы і метады работы кабінета. З году у год расце кнігавыдача, больш актыўна сталі выкарыстоўвацца экскурсіі у Дом-музей І з'езда РСДРП, музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Беларускі дзяржаўны музей. У гэтым навучальным годзе, напрыклад, музеі наведалі больш тысячы студэнтаў. Супрацоўнікі кабінета перыядычна арганізоўваюць сустрэчы з ветэранамі Кастрычніка, Вялікай Айчыннай вайны, перадавікамі вытворчасці, аказваюць практычную дапамогу лектарам Таварыства «Веды» у падрыхтоўцы лекцый, прыцягваюць аспірантаў і студэнтаў да прапаганды ленінскай тэарэтычнай спадчыны сярод рабочых прамысловых прадпрыемстваў Мінска.

Няспыннае павышэнне тэарэтычнага і метадычнага ўзроўню выкладання грамадскіх навук прад'яўляе ўсё большыя патрабаванні да кабінета гісторыі КПСС, яго лабарантаў. Яны павінны чутка адклікацца на паяўленне новых прагрэсіўных тэндэнцый у духоўных запатрабаваннях студэнтаў і адказваць на іх ўкараненнем у навучальны працэс усяго новага, перадавога ў методыцы і вузаўскай практыцы. У гэтым плане многае робіцца нашым кабінетам. Так, на занятках па гісторыі КПСС шырока прымяняюцца тэхнічныя сродкі, якія атрымалі распаўсюджанне у радзе вну краіны: дыяпраектар, магнітафон, прайгравальнік. Фота- і фанатэка кабінета маюць дыяфільмы па ўсіх тэмах курса, магнітафонныя запісы прамоў У. І. Леніна, выдатных дзеячоў міжнароднага рабочага і камуністычнага руху, кансультацый выкладчыкаў кафедры па некаторых вузлавых пытаннях гісторыі КПСС.

Усе выкладчыкі асвоілі тэхнічныя сродкі і паспяхова іх прымяняюць на занятках, адбіраюць той фота- і фонаматэрыял, які найбольш поўна адлюстроўвае тэму, а таксама спецыфіку аўдыторыі. Напрыклад, кандыдат гістарычных навук М. Г. Жаркоў пры дэманстрацыі на семінары дыяфільма па тэме «Утварэнне РСДРП. Узнікненне бальшавізму (1883—1904 гг.)» выбраў для паказу такія кадры: «Развіццё капіталізму у Расіі пасля адмены прыгоннага права», «Група «Вызваленне працы» і яе дзейнасць», «Пецярбургскі «Саюз барацьбы за вызваленне рабочага класа» і яго уплыў на развіццё сацыял-дэмакратычнага руху у Расіі» і іншыя.

Пры выкарыстанні дыяфільма «Партыя бальшавікоў у перыяд рэакцыі (1907—1910 гг.)» выкладчыкі Ф. І. Мельнік, Л. П. Максімава, В. З. Протчанка, Т. К. Калеснікава ілюстравалі дыяграмы аб стачачным руху, масавых рэпрэсіях, кольскасным саставе партыйных арганізацый. Дацэнты І. О. Царук, З. Г. Грыгор'ева, выкладчыкі Г. С. Асташонак, Т. Я. Галко дэманструюць дыяфільмы поўнасцю, суправаджаючы іх кароткімі каментарыямі.

Калі у звычайных умовах выкладчыкі кафедры выкарыстоўвалі два-тры плакаты, то ў дыяфільме — 15—20 самых розных па свайму характару нагляднасцей.

Аднак спецыфіка гатовых стужак не дазваляе ўсебакова разгледзець тое ці іншае пытанне. Улічваючы гэта, дацэнты Е. А. Васілеўская, М. А. Пашкевіч, прафесары Ус. М. Сікорскі, М. Я. Шкляр і іншыя ўнеслі прапанову распрацаваць і зрабіць сіламі кафедры і кабінета такія дыяфільмы, якія б найбольш поўна адпавядалі зместу лекцый і семінараў. Гэтыя прапановы будуць усебакова абмеркаваны на бліжэйшым пасяджэнні кафедры, выкладчыкі распрацуюць сцэнарый, які вызначыць змест дыяфільмаў па кожнай тэме курса гісторыі КПСС, пасля чаго супрацоўнікі кабінета сваімі сіламі падрыхтуюць іх.

Выкладчыкі кафедры і супрацоўнікі кабінета плануюць зрабіць такія наглядныя дапаможнікі, якія б поўнасцю адпавядалі вузаўскаму курсу навучання, ступені навуковай распрацоўкі тых ці іншых палажэнняў. Між тым здзяйсненне гэтых планаў, а таксама рашэнне бягучых арганізацыйных праблем звязана з сур'ёзнымі цяжкасцямі. Адміністрацыйна-гаспадарчая частка універсітэта не ў сілах аказаць аператыўную і кваліфікаваную дапамогу кабінетам грамадскіх навук у афармленні іх актуальнай, маляўнічай наглядная агітацыяй, дапаможнікамі, тэхнічным абсталяваннем. У сувязі з гэтым супрацоўнікам кабінетаў нярэдка даводзіцца выконваць не адпавядаючую профілю работу, затрачваць многа часу на рашэнне праблем забеспячэння. Думаецца, што даўно наспела патрэбнасць стварыць ва універсітэце спецыялізаваную майстэрню, дзе можна было б зрабіць прасцейшыя наглядныя дапаможнікі, стэнды, дыяфільмы, дыяпазітывы, фатаграфіі і г. д. Гэта з'явіцца важнай падмогай у рабоце супрацоўнікаў кабінетаў і выкладчыкаў кафедр грамадскіх навук.

Прымяненне тэхнічных сродкаў навучання звязана з іншымі арганізацыйна-тэхнічнымі перашкодамі. На гуманітарных факультэтах адсутнічаюць спецыяльна абсталяваныя для прымянення тэхнічных сродкаў аўдыторыі, у сувязі з чым выкладчыкі не заўсёды могуць выкарыстоўваць дыяфільмы, магнітафонныя запісы. Па гэтай жа прычыне ў вучэбным працэсе не выкарыстоўваецца кіно.

Усе гэтыя недахопы адмоўна адбіваюцца на нашай рабоце, не дазваляюць у поўную меру выкарыстоўваць той арсенал сродкаў, які садзейнічае глыбокаму засваенню студэнтамі гісторыі Камуністычнай партыі і фарміраванню ў іх марксісцка-ленінскага светапогляду.

У супрацоўнікаў кабінетаў грамадскіх навук у працэсе работы ўзнікаюць свае праблемы, тыя ці іншыя пытанні, прапановы. Вельмі б хацелася, каб ■ выкладчыкі, студэнты, лабаранты, загадчыкі кабінетаў часцей дзяліліся сваімі думкамі на старонках газеты. Абмен практычным вопытам паслужыць далейшаму паляпшэнню работы кабінетаў.

П. БОНДАР,
загадчык кабінета.

ДЗЕСЯЦЬ ДЗЁН У БАЛГАРСКІХ СЯБРОЎ

Гэта была цікавая і карысная паездка. Па запрашэнню грамадскіх арганізацый Сафійскага універсітэта імя Клімента Ахрыдскага наш ансамбль танца «Крыжачок» наведаў Балгарыю і прыняў удзел у студэнцкім свяце. Па традыцыі афіцыйнае адкрыццё студэнцкага свята — у Нацыянальным оперным тэатры. Тут упершыню балгарская моладзь пазнаёмілася з танцамі і песнямі, прадстаўленымі нашымі самадзейнымі артыстамі.

Мы добра разумелі, што мэта нашай паездкі не толькі выступленні па сцэнах тэатраў і клубаў, наведанне гістарычных месц і агляд помнікаў. Галоўнае было у іншым — ці зможам мы перадаць свае шчырыя і цёплыя пачуцці давер'я і павагі балгарскім таварышам, ці замацуем настойлівае імкненне да узаемаразумення і дружбы як з пашага, так і з балгарскага боку. У сардэчным імкненні да дружбы мы пераканаліся пры першай сустрэчы на Сафійскім вакзале, дзе нас вельмі цёпла сустрэлі.

І яшчэ больш роднымі і блізкімі сталі нам балгарскія сябры пасля знаёмства з помнікам Вызвалення, збудаваным у гонар савецкіх воінаў, і наведання брацкай магілы, дзе пахаваны тысячы і тысячы балгарскіх і савецкіх салдат, загінуўшых у баях за вызваленне Балгарыі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. І захацелася яшчэ лепш пазнаёміцца з Балгарыяй, больш пазнаць аб жыцці яе народа, захацелася абняць нашых балгарскіх сяброў, нашых памочнікаў— Петка і Розу—прадстаўнікоў універсітэцкага камітэта камсамола. Гэта былі сапраўдныя сябры, добрыя і няўрымслівыя.

Праграма канцэртаў народнага ансамбля танца «Крыжачок» працягвалася звычайна дзве гадзіны. Кожны нумар суправаджаўся авацыямі гледачоў. Іх, вядома, выклікалі не толькі пачуццё салідарнасці, але і прыгажосць, і высокае майстэрства выканання, і той тэмперамент, што так выгадна выдзяляў танцораў, спевакоў, музыкантаў. Вялікім поспехам карысталіся нашы беларускія народныя танцы «Крыжачок», «Чобаты», якія вызначаліся яркім, самабытным нацыянальным характарам. Не меншае захапленне выклікалі танцы народаў Савецкага Саюза— мяккі і лірычны рускі танец «Сустрэча», імклівы украінскі «Гапак». І у гэтым вялікая заслуга кіраўніка ансамбля танца «Крыжачок» Мікалая Вікенцьевіча Лапшы, кіраўніка аркестровай групы ансамбля Уладзіміра Сяргеевіча Краснаярцава, саміх выканаўцаў і нашых нястомных спевакоў Людмілы Ярохі і Сяргея Косціна.

У вольны час мы знаёміліся з Сафіяй. Славіцца Балгарыя сваёй маляўнічай прыродай, цудоўным спалучэннем старыны і сучаснасці. Што гэта так, мы пераканаліся самі, пабываўшы у гісторыка-рэвалюцыйных музеях, у карціннай галерэі. З захапленнем аглядалі Рыльскі манастыр, які гарманічна ўпісваецца у «архітэктуру» Рыльскіх гор, і помнік-храм Аляксандра Неўскага з іх непаўторнымі роспісамі, выкананымі старажытнымі славянскімі майстрамі, з цудоўнай акустыкай, захапляючай сучасных спецыялістаў сваім чыстым гучаннем.

Цяпер паездка да балгарскіх сяброў ужо аформлена шматлікімі матэрыяламі, фатаграфіямі і такім чынам увайшла у гісторыю нашага універсітэта яшчэ адной цікавай старонкай.

Зараз, як і ўсе студэнты, рабяты здаюць экзамены, а вечарамі іх можна зноў бачыць на рэпетыцыі.

А. ДЗЕДУШКІН,
член камітэта камсамола БДУ.

РАДАСЦЬ ТВОРЧАСЦІ

— Дзе выступалі! Як прымалі канцэрты!

Ларыса КАРПУСЬ, студэнтка II курса хімфака:

— Першы канцэрт мы давалі у Нацыянальным оперным тэатры у Сафіі. Гэта было вельмі адказнае выступленне. Ансамбль меў вялікі поспех. Ззычайна з паловы танца пачынэліся апладысменты і супраззджалі яго да канцэ. Часта выклікалі на «біс». Нам паднеслі кветкі, дзякавалі за канцэрт.

Мы выступалі у Таварыстве балгара-савецкай дружбы, дзе прысутнічалі супрацоўнікі пасольства Савецкага Саюза, перад удзельнікамі міжнароднага студэнцкага сімпозіума, на радзіме Тодара Жыкава у вёсцы Правеца, перад курсантамі вучылішча. Усе канцэрты без выключэння прайшлі з вялікім поспехам.

— З кім вы пазнаёміліся! Хто стаў вашымі сябрамі!

Аляксандр АЛЯШКЕВІЧ:

— Мне давялося жыць у інтэрнаце у адным пакоі з іранцам Джамілем. Ён аспірант, гісторык, ведае 8 замежных моў. Мы доўга гутарылі з ім аб нашай навуцы. Джаміль хацеў бы пабываць у Савецкім Саюзе. Ён многа чытаў і чуў аб нашай краіне. Ёсць у яго запаветная мара: пабываць у бібліятэцы імя У. І. Леніна у Маскве, дзе можна знайсці любую кнігу.

Часта мы збіраліся разам з балгарскімі студэнтамі і спявалі савецкія эстрадныя песні, старынныя рамансы і песні былых гадоў.

Студэнты вывучаюць рускую мову і нядрэнна размаўляюць па-руску.

Неяк праходзіла у нас сумесная рэпетыцыя з агульнагарадскім танцавальным ансамблем г. Сафіі. Мы пераймалі балгарскія рухі, а яны у нас рускія. Для балгарскіх танцораў незвычайнымі былі нашы імклівыя, энергічныя танцы. Асабліва падабаліся трукі, ды і гледачы таксама заусёды былі у захапленні ад складаных прыжкоў.

— Што больш за усё вам спадабалася у Балгарыі!

Таццяна ЗІМЯНІНА, студэнтка II курса філфака:

— Самае вялікае уражанне аказала на мяне прырода. Сафія знаходзіцца у акружэнні гор, якія захапляюць сваей прыгажосцю. Нас вазілі на экскурсію у Рыльскі манастыр. Тут давялося убачыць не толькі багацейшы роспіс, але і упершыню у жыцці мазэхізу і нават патрыярхз.

Апошняе пытанне кіраўніку ансамбля танца «Крыжачок» **Мікалаю Вікенцьевічу ЛАПШЫ:**

— З якэй праграмай вы паехалі у Балгарыю! Якія далейшыя планы ансамбля!

— Мы павезлі у Балгарыю зусім новыя два танцы, пастауленыя нядауна. Гэта цыганскі «Ля шатра» (карцінкі мінулага) і беларускі танец «Чобаты». Парад паездкай ішла старэнная падрыхтоука. Займаліся па тры—чатыры разы у тыдзень. У рабят было вялікае жаданне паказаць свае магчымасці.

Нашы канцэрты вельмі спадабаліся балгарскім сябрам, і яны яшчэ раз запрасілі нас да сябе у госці у ліпені—жніўні для выступлення перад жыхарамі Чарнаморскага узбярэжжа. Цяпер ансамбль будзе працаваць над новымі пастаноукамі.

Хацелася б, каб да нас у ансамбль прыйшлі новыя танцоры, студэнты БДУ. Навучыцца танцаваць нацяжка, патрэбна толькі вялікае жаданне. Затое колькі радасці пасля прыносяць паездкі, канцэрты, творчая работа у калектыве.

Л. БАРЭЙКА.

НА ЗДЫМКАХ: знаёмства з Рыльскім манастыром; мост цераз горную рэчку.

Фота Ю. МОРЫНЦА.



ВЯЧЭРНІ ХІМФАК.

УДАЧНЫ РОЗЫГРЫШ

Нядауні розыгрыш латарэі ДТСААФ аказауся сапрауды шчаслівым для студэнтаў і выкладчыкаў універсітэта. Рэалізаваныя білеты на суму у 5.600 рублёў склалі выйгрышную суму у 5823 рублі. «Масквіч-412», матаролер «Турыст», радыёпрыёмнік «Саната», дзве гумавыя лодкі, гадзіннікі і іншыя рэчы знайшлі сваіх шчасліучыкаў на фізфаку, гістфаку, біяфаку і іншых факультэтах.

М. ГАРЛАТАЎ.

Чым-чым, а поспехамі у мастацкай самадзейнасці бі-ёлагі раней пахваліцца не маглі. Былі сярод студэнтаў здольныя спевакі, танцоры і дэкламатары. Як збярэцца да каго-небудзь на свята— смех, жарты, песні не змаўкаюць. А на конкурс ці агляд мастацкай самадзейнасці нікога і па валаку не загнеш. Скептычна аднекваліся:

— Ат, ізноў у апошніх будзем. Няма у нас талентаў.

Спрабавалі гаварыць аб самадзейнасці на камітэце камсамола. Бушавалі спрэчкі. Дыскусіі, парады, прапановы траплялі у пасцешную газету. Але воз па-ранейшаму стаяў на месцы. Так вялося з году у год.

На аглядах мастацкай самадзейнасці біёлагі з незатоенай зайздрасцю пазіралі на музычныя інструменты у руках юрыстаў, філолагаў.

— Эх, нам бы такія! Можа б і не плялися у хвасце.

Нарэшце набылі музычныя інструменты. І неўзабаве з 817-й аудыторыі, якую адвялі для удзельнікаў мастацкай самадзейнасці, загучалі музычныя акорды.

Так пачаў сваё існаванне эстрадны аркестр. А праз некаторы час на базе аркестра быў створан вакальна-інструментальны ансамбль. Душой яго і фактычным кіраўніком стала Эла Чыркун, цяпер студэнтка чацвёртага курса. Прыйшлі у ансамбль студэнтка трэцяга курса Наташа Савачкіна, другакурсніца Тамара Ткач. Яны сталі салісткамі.

З'явілася магчымасць расшырыць рэпертуар, каб удзельнічаць у паездках агітбрыгады, вылучыць найбольш цікавыя нумары на універсітэцкі агляд. Чакалі яго з нецярплівасцю. Разумелі: адразу на высокае месца разлічваць цяжка. Бедны пакуль што рэпертуар, не адпрацаваны як след усе нумары. А пястрымнае пачуццё гонару пярэчыла:

— А чым мы горшыя за іншых? Там таксама не прафесіяналы!

І вось доўгачаканы поспех. На апошнім аглядзе мастацкай самадзейнасці артысты біяфака занялі чацвёртае месца. Не прызавое, прауда, але гэта не так ужо важна. Галоўнае, што на факультэце створан пастаянны калектыў. Самадзейнасць не будзе больш у загане. Што гэта так, сведчаць факты. Хутка будзе арганізаван танцавальны калектыў, для якога аркестр рыхтуе музычнае суправаджэнне, падбіраюцца дэкламатары.

Створаны добрыя ўмовы для рэпетыцый, поунасцю закуплены музычныя інструменты. Дарэчы, нядауна набылі электраарган.

Шмат увагі самадзейным артыстам удзяляюць партыйныя і грамадскія арганізацыі факультэта. Нямала часу аддаюць мастацкаму калектыву супрацоўнік кафедры сістэматыкі раслін Анатоль Тарасавіч Федарук, член камітэта камсамола Ала Бондар, член прафбюро Людміла Стромка. Па-ранейшаму душой гуртка з'яуляецца Эла Чыркун. Яна знае музычныя інструменты, добра грае на электраарган е, спрабуе пісаць песні.

Першыя крокі удалыя. Якія будуць наступныя? Гэта залежыць ад саміх студэнтаў.

М. АСІНСКІ,
М. МАРКЕВІЧ,
студэнты.

КАЛІ ЁСЦЬ ЖАДАННЕ

ПАКЛАПАЦІЦЕСЯ АБ ЗДАРОЎІ

З прычыны няправільнага размеркавання рабочага часу і адсутнасці фізічнай нагрузкі студэнты часта звяртаюцца са скаргамі на моцныя галауныя болі, дрэннае запамінанне і разуменне вывучаемых прадметаў, трывожны сон. Пазбегнуць гэтых непрыемных з'яу можна шляхам арганізацыі правільнага рэжыму працы і адпачынку.

Аб рэжыме дня студэнта мы ужо пісалі. Цяпер, у час сесіі, трэба асаблівую ўвагу звярнуць на харчаванне (яно павінна быць рэгулярным і паунацэнным) і сон. Вельмі шкодна займацца начамі. Спаць трэба не менш 8 гадзін, лепшы час для сну з 23 да 7 гадзін.

Вельмі добрыя вынікі дае актыуны адпачынак — змена разумовай працы фізічнай. Заняткі трэба чаргаваць з адпачынкам: спартыунымі трэніроўкамі, прагулкамі, катаннем на канках, лыжнымі вылазкамі. На свежым паветры трэба бываць не менш дзвюх гадзін у дзень. Правільна адпачываць не менш важна, чым правільна працаваць.

Дастатковае харчаванне, знаходжанне на свежым паветры, здаровы адпачынак і сон—неабходныя ўмовы, якія папярэджваюць стамленне.

А. НІСНЕВІЧ,
урач паліклінікі БДУ.

Рэдактар
А. А. НІКОЛЕНКА.

Наш адрас: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Т—22-07-19.
Ордэна Працоунага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

АТ 02022 Тыраж 2000 экз. Заказ 045.